■ Хто каго?

# «ПРЫКУПІЛА БАБА ЗОСЯ, ШТО ПА ЗНІЖКАХ ДАСТАЛОСЯ...»

***Што было — было. І, магчыма, якраз у маі? Хлопец з дзеўкай на прыроду паехалі. Месца выбралі — проста цуд! Лес там, рэчачка, а за ёю — луг, прычым зялёны, мурожны... Дзяўчо, убачыўшы яго, не ўтрымалася: разулася і басанож — па кладачцы, па траве... «Адарвалася», карацей, нахадзілася, набегалася, кветак нарвала, — вярнулася назад.***

***Хлопец тым часам палатку паставіў, рэчы расклаў... Абняў каханую, пасадзіў поплеч. «Стамілася?» — пытаецца і на ножкі яе глядзіць. «Пальчыкі, — кажа, — смешныя: маленькія, крывенькія... Гэта з-за чаго?» — «Не паверыш, — з-за пераканання». — «З-за якіх такіх?..» — не разумее хлопец. — «Дурных: як убіла ў галаву ў пятым класе, што нашу 35-ы памер, дык дагэтуль не скідаю».***



Гераіня верхняга здымка (на яе можна яшчэ раз паглядзець), згадзіцеся, зусім не такая: іншы ўзрост у яе, іншыя «перакананні». Яна, мусіць, таксама нешта «ўбіла ў галаву». А вось што?

У рэдакцыйнай пошце, як заўсёды, многа меркаванняў, многа прапаноў! У прыватнасці, **спадар Віктар Сабалеўскі з Узды лічыць,** што ў жанчыны

*Няма часу на яду,*
*На прысмакі — грошай,*
*Аж губляе на хаду*
*Новыя галёшы.*
*На работу у калгас*
*Бегае заўзята...*
*Для яе спыніўся час*
*У сямідзясятых.*

Тут мала сказаць: «Бывае...». Варта, магчыма, спытаць: «Ці толькі для яе?»

«Небезвядомы Штэпсель, — прыгадвае **спадар Мікалай Старых з Гомеля,** — некалі скардзіўся на жонку: маўляў, з хаты не выцягнуць — то прыбірае, то гатуе... А Тарапунька яму шчыра зайздросціў, казаў, што дома сваю палову амаль не бачыць: яна ўсё на працы ды на працы».

Акурат такім стаханаўкам і прысвяціў свае радкі шаноўны Мікалай Валянцінавіч:

*Неспакойная жанчына*
*Працавітая Яніна:*
*Вечна некуды ляціць,*
*Хоча шмат чаго зрабіць.*
*Але ж часу ёй няма*
*Каб... паслухаць салаўя,*
*З любым выправіцца ў бор,*
*Дзе... «адпах» яе чабор.*

Сумна, крыўдна за жанчыну, у якой, паводле **спадара Івана Сіманёнка з Пастаў,**

*Неўпрыкмет жыццё прайшло*
*У мітусні і гонках.*
*Ды вярнулася ў сяло*
*Колісь чэмпіёнка...*
*Па начах баліць спіна*
*І сустаў каленны,*
*Але шлыхае яна*
*Крокам пераменным!*

Лагічныя пытанні: куды — канкрэтна? І чаму ў такім адмысловым абутку?

Лагічныя і адказы — ад **спадара Міколы Кісяля з Мінска:**

*Крочыць Маня-дабрадзейка*
*У чунях бульбачку саджаць:*
*Зручна — й ногі не пацеюць,*
*І адлегласць адмяраць...*
Ды каб толькі!
*Да суседкі баба Феня*
*Ідзе па бульбу на насенне:*
*Што не ўлезе ў кошык,*
*Прынясе ў галёшах.*

Гэтую здагадку выказала **спадарыня Валянціна Гудачкова з Жыткавічаў.**

Нямала іх, здагадак-прапаноў, і ў **сужэнцаў Івана ды Ніны Астроўскіх з Мінска:**

*Цётка Маня, як Сусанін,*
*Куды хочаш завядзе,*
*Бо яна ў сваім «убранні»*
*Можа бегаць па вадзе.*
А таму —
*Хтось улёгся на пасцель*
*Ды глядзіць навіны...*
*Цётка ж Маня — за кашэль*
*І ў журавіны!*

А яшчэ яна можа шлыхаць (то-бок крочыць) дамоў. Прычым — зусім не з балота, а наадварот:

*Бабка з нашага сяла*
*Дзень у Мінску прабыла,*
*У новых «лодачках» хадзіла,*
*На абцасах пафарсіла...*
*Толькі туфлі той бабулі*
*Панацёрлі мазалёў.*
*Дзякуй родзічам — абулі,*
*Каб змагла дайсці дамоў.*

Атрымліваецца, туфлі на высокіх абцасах і сапраўды рэч — цудоўная: варта прыбрацца, і ўсё: ты — шыкоўная жанчына, варта скінуць — найшчаслівейшы чалавек.

Дзе можна гэта адчуць, прычым па поўнай? Нечаканая здагадка, з таго самага канверта, але ж, трэба разумець, ад **спадара Івана Астроўскага?**

*Шмат газета надрукуе,*
*Пра Марусіны прыгоды...*
*Я ж лічу — яна шыбуе*
*На паказ вясковай моды.*
*Вы гадайце як заўгодна,*
*Але ж сёння — у чунях модна!*

Трэба разумець, у маі, падчас пасяўных работ, у «адрыве» ад якіх **спадарыня Соф'я Кусянкова з Рагачоўшчыны** піша:

*Сёння пенсія такая,*
*Што на боты не хапае...*
*Каб купіць іх, конча трэба*
*Насадзіць другога хлеба!*

А ўжо потым, як лічыць **спадар Віктар Сабалеўскі,** можна і... заспяваць:

*Сама бульбачку садзіла,*
*Сама буду ўбіраць...*
*Каб жа толькі урадзіла,*
*Каб было мне што прадаць...*
*Потым — справіць лабутэны*
*І успомніць маладосць...*
*А пакуль — хіба на чуні*
*У кабеты грошы ёсць.*

Анекдот у тэму. Дзве жанчыны ранкам сустрэліся. «Я сабе новыя туфлі купіла, паўзарплаты аддала», — кажа адна. — «Авохці мне!» — дзівіцца другая, — што ж гэта за туфлі такія?» — «Ды звычайныя... Гэта зарплата ў мяне такая».

Аднак, на думку **спадарыні Лаўрынчук з Брэста,** не ў ёй, не ў зарплаце, шчасце, не ў грашах:

*Муж у Карпаўны харошы,*
*Ёй аддаў свае галёшы.*

Джэнтльмен, значыць, малайчына! Ды дзеля такога...

Што дзеля яго — вось такога — могуць зрабіць жанчыны, ведае **спадар Мікола Кісель:**

*Трэба? У поле пойдзе Тома, —*
*Поўным будзе кошык!*
*У валёнках — муж ля дома,*
*А яна — у галёшах.*

Як той казаў, сем паноў, двое штаноў; хто раней устаў, той штаны ўзяў.

А вось з якой гэта прычыны? Цікавае пытанне! **Спадарыня Валянціна Гудачкова** адказвае на яго падэскю — трыма новымі. Лічыце:

*Дзед з бабуляй моцна п'юць?*
*Ці ўсё ўнукам аддаюць?*
*Мо ў панчоху сунуць грошы?..*
*На дваіх адны галёшы.*

Але ж могуць быць і іншыя прычыны. Пра адну з іх піша **спадар Ягор Жылук з Пухавіччыны:** «Каля сямі гадоў (з маіх 22) чытаю сваю любімую «Звязду» і заўсёды шчыра смяюся з рубрыкі «Хто каго?». Натхнёны прыкладам сапраўдных заўзятараў, дасылаю свае радкі:

*Тралі-валі, цілі-цілі:*
*У вясковай нашай краме*
*Тыдзень зніжак абвясцілі!*
*Цётка Воля без разбору*
*Накупляла сабе ўбораў*
*І фарсіць у агародах,*
*У галёшах-скараходах.*

Бо людзі ж і сапраўды чакаюць распродажаў, — піша **спадар Ягор,** а калі дачакаюцца, дык купляюць часам усё — нават без прымеркі».

Гэта дрэнна? Ды як сказаць. Паводле **сужэнцаў Астроўскіх** — не:

*Прыкупіла баба Зося,*
*Што па зніжках дасталося.*
*І няхай з яе смяюцца,*
*Яна мае ў што абуцца!*

Паводле ж **спадарыні Гудачковай** — добрага ў гэтым мала:

*У вёску — астачу*
*(Я ў гэта паверу):*
*У краме абутак*
*Аднога памеру.*
*А хто тыя «ночвы»*
*Цягаці нягож,*
*Таму застаецца*
*Хадзіць басанож.*

Досыць нечаканы «маршрут» прапануе **спадарыня Любоў Чыгрынава:**

*Як іду на талаку, —*
*Ледзьве ногі валаку...*
*А зайграе дзе гармонь,*
*Усхаплюся, як агонь!*

З таго ж канверта цэлая гісторыя:

*У суседкі ўнук жыў летам,*
*Быў пацехаю пры гэтым:*
*Мераў ногі, мераў рост —*
*Да бабулі, бач, дарос!*
*А праз год прывёз Алёша*
*Бабці новыя галёшы.*
*Падарыў — вачам не верыць:*
*«На сябе ж у краме мераў!»*

Растуць дзеткі. Дай бог, на радасць.

«Паглядзела на здымак, — піша, прынамсі, **спадарыня Гудачкова,** — і ўспомніла, як мая цётачка Фядора (светлай памяці!) жаніла трэцяга сына. А меншаму, Юрку, тады гадоў з дзесяць было... Ён таксама на вяселле збіраўся. Новы касцюмчык надзеў, чаравікі... Ну і паехалі — з Турава да чыгункі аўтобусам, потым цягніком да Львова і зноў аўтобусам да мястэчка, дзе нявеста жыла. Суткі ў дарозе... Праўда, хлопчык нідзе не прысеў. І ніводзін камень не прапусціў — кожны трэ было падфутболіць... Факт, што на вяселле прыехалі, на чаравікі глянулі, а яны быццам са сметніцы, а не з крамы. Давялося новыя купляць.

А вырас той Юрка, — працягвае Валянціна Апанасаўна, — і аб'ездзіў увесь Савецкі Саюз, да палкоўніка даслужыўся, розных чаравікаў знасіў — незлічона! Цяпер — на пенсіі, на дачы жыве, у галёшах шчыруе. Вось і атрымліваецца, што яны таксама патрэбныя, бо:

*Добра меці боцікі,*
*Добра меці туфлі —*
*З моднымі абцасамі,*
*З рознымі украсамі...*
*Для сялянскай жа работы*
*Сама тое — гнаятопы!*

Але ж не толькі! «Хоць і не сезон яшчэ, — піша **спадар Валерый Гаўрыш з Чавусаў,** — але, глянуўшы на здымак, я адразу падумаў, што жанчына ідзе ў лес. Чаму ў такім абутку? Ды зразумела ж:

*Мясціны, дзе баравікі,*
*Не раскрываюць грыбнікі...*
*Сляды Ганула маскіруе:*
*Такіх — ніхто «не расшыфруе»...*

Больш за тое (на думку **спадарыні Галіны Нічыпаровіч з Уздзеншчыны):**

*Хоць і грошай — кот наплакаў,*
*Жонцы чуні справіў Якаў.*
*Будзе лётаць па грыбочкі,*
*Як на лыжах,*
*Каб слядочкі,*
*Калі звлудзіць, —*
*адшукаць.*
*І не трэба горла драць.*

Зручна — што ні кажы! А таму актуальная ідэя ад **сужэнцаў Астроўскіх:**

*Навукоўцы, прэч дрымоту,*
*Без адкладу, у гэты год,*
*Патэнтуйце для работы*
*Цёткі Мані ўсюдыход!*

Што ў ім дрэннага? На думку **спадарынь Любові Чыгрынавай і Соф'і Кусянковай,** так бы мовіць, віду не мае:

*— Вось, прывёз на дачу зяць —*
*Будзе пудзілам стаяць,*
*Каб вароны ды драздзы*
*Не тварылі больш бяды,*
піша першая. А другая дадае:
*Праўду кажа гэта фота:*
*Баба прэцца на работу...*
*Трэба соткі скарачаць,*
*Каб вось так не выглядаць.*

Жаночая драма — і сапраўды: азірнуцца не паспела, як перасталі... азірацца.

Але ж, як той казаў, ці варта перажываць, што станік першага памеру, калі туфлі 43-га! Было б у іх куды (і з кім!) выйсці, бо хада, як казаў Гіпакрат, замяняе чалавеку ўсе лекі, і ні адно з іх (тых лекаў) не можа замяніць хады. Хіба што смех? А таму самы час падводзіць вынікі. Такім чынам, паводле шматлікіх меркаванняў чытачоў, найлепшыя радкі да мінулага конкурснага здымка (гл. "Звязда" за 1 красавіка г. г. На ім, нагадаем, былі мужчына, які ў «кампаніі» двух катоў вудзіў рыбу) атрымаліся ў мінчан **сужэнцаў Астроўскіх, спадарынь Валянціны Гудачковай з Жыткавічаў, Соф'і Кусянковай з Рагачоўшчыны, Любові Чыгрынавай з Мінска, у спадароў Івана Сіманёнка з Пастаў, Валерыя Гаўрыша з Чавусаў і Мікалая Старых з Гомеля.**

З гэтым, апошнім, меркаваннем пагадзілася і журы маленькае рэдакцыйнае. А значыць, прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцам «Звязду» на трэці квартал бягучага года накіроўваецца ў Гомель.

Хочаце, каб газета прыходзіла і да вас? Тады варыянтаў два: першы — аформіць падпіску (а зрабіць гэта ніколі не позна), другі — уважліва пагледзець на новы (ніжні) здымак, прыдумаць да яго подпіс (можна — некалькі, але кароткіх (не больш за восем радкоў) і даслаць у рэдакцыю. Лепшыя прапановы будуць надрукаваныя. Аўтара ж **найлепшай** — чакае прыз у выглядзе падпіскі. Поспехаў!

**Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*

***Ад яе ж** шчырыя прабачэнні ўсім, чые радкі гэтым разам не прайшлі строгага конкурснага адбору* ■



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.